УДК
ББК
М 33

Рэкамендавана да друку
Вучоным Саветам Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Рэцэнзенты: доктар гістарычных навук, акадэмік *Касцюк М. П.;*
доктар гістарычных навук, прафесар *Швед В. В.;*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *Яноўская В. В.;*
кандыдат гістарычных навук *Лісейчыкаў Д. В.;*
кандыдат гістарычных навук *Крук У. П.*

**ISBN 978-985-6740-??-?**

© Матвейчык Д. Ч., 2011
© ТАА «Лімарыус», 2011



# ЗМЕСТ

Пералік умоўных абазначэнняў і скарачэнняў . . . . . 4
УВОДЗІНЫ . . . . . 5
1. ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ: КАРОТКІ АГЛЯД . . . . . 11
1.1. Гістарыяграфія . . . . . 11
1.2. Крыніцы . . . . . 13
2. ПРЫЧЫНЫ ЭМІГРАЦЫІ. РАССЯЛЕННЕ ЭМІГРАНТАЎ З БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ . . . . . 17
2.1. Палітыка расійскіх уладаў у адносінах да ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. . . . . . 17
2.2. Колькасць і рассяленне эмігрантаў у краінах Заходняй Еўропы . . . . . 24
3. ГУРТАВАННЕ ЎРАДЖЭНЦАЎ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ У ЭМІГРАЦЫІ . . . . . 43
3.1. Арганізацыі і палітычныя плыні *Вялікай эміграцыі*: агульны агляд . . . . . 43
3.2. Таварыства Літоўскае і Рускіх Зямель . . . . . 48
3.3. Таварыства Братэрскага Аб’яднання . . . . . 60
3.4. Літоўска-Рускі Клуб . . . . . 67
4. САМАСВЯДОМАСЦЬ І САМАВЫЗНАЧЭННЕ ЭМІГРАНТАЎ З БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ . . . . . 71
5. УПЛЫЎ ЭМІГРАЦЫІ НА ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНЫ РУХ НА РАДЗІМЕ . . . . . 77
5.1. *Экспедыцыя Заліўскага* на Беларусі і Літве . . . . . 77
5.2. Дзейнасць Шымана Канарскага . . . . . 96
6. ПІСЬМЕННІЦКАЯ І ВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У ЭМІГРАЦЫІ ЎРАДЖЭНЦАЎ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ: АГУЛЬНЫ АГЛЯД . . . . . 107
7. АМНІСТЫЯ І ВЯРТАННЕ ЭМІГРАНТАЎ НА РАДЗІМУ . . . . . 131
ЗАКЛЮЧЭННЕ . . . . . 141
ДАДАТАК
I. Імянны спіс сяброў Таварыства Братэрскага Аб’яднання . . . . . 143
II. Акт заснавання і Статут Літоўска-Рускага Клуба . . . . . 147
Спіс ілюстрацый . . . . . 153
Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры . . . . . 155
Спіс публікацый аўтара . . . . . 182
Паказальнік імёнаў . . . . . 184
Паказальнік геаграфічных назваў . . . . . 191

# ПЕРАЛІК УМОЎНЫХ АБАЗНАЧЭННЯЎ І СКАРАЧЭННЯЎ

адв. — адварот
арк. — аркуш
аўт. — аўтар
в. — вёска
ваяв. — ваяводства
ВКЛ — Вялікае княства Літоўскае
воп. — вопіс
г. — 1) год; 2) горад
гг. — гады
ген. — генерал
гл. — глядзі
ГЛТ — Гісторыка-Літаратурнае Таварыства
губ. — губерня
дэп. — дэпартамент
інш. — іншыя
к. — канец
кап. — капейка, капеек
ЛВК — Літоўскі Вайсковы Камітэт
м. — мястэчка
маёнт. — маёнтак
пав. — павет
пач. — пачатак
ПНК — Польскі Нацыянальны Камітэт
пол. — польскі
р. — рака
руб. — рубель, рублёў
с. — старонка
ст. — стагоддзе
стст. — стагоддзі
т. — том
ТБА — Таварыства Братэрскага Аб’яднання
ТЛРЗ — Таварыства Літоўскае і Рускіх Зямель
ТТТ — Таварыства Трэцяга Траўня
тыс. — тысяча, тысяч
ф. — фонд
фальв. — фальварак
фр. — французскі
чал. — чалавек
ap. — apyrašas (літ. — вопіс)
f. — fondas (літ. — фонд)
p. — page (фр. — старонка)
rkps. — rękopis (пол. — рукапіс)
s. — strona (пол. — старонка)
b. — bojimas vienetas (літ. — адзінка захавання)
t. — tom (пол. — том)



# УВОДЗІНЫ

*Выгнаныя з роднага краю, бадзягі па свеце, пазбаўленыя ўсяго, што магло нам быць мілага, мы не перасталі, аднак, быць Палякамі, а святасць нашай справы, перакананне, што мы выканалі свой абавязак, падзялянне нашых пачуццяў усімі народамі, становіцца гарантыяй нашай будучыні, настолькі для нас добрай, наколькі сённяшні стан рэчаў працягвае спрыяць намерам Прыгнятальнікаў чалавецтва!*

Таварыства Літоўскае і Рускіх Зямель
да землякоў і таварышаў зброі. —
Парыж, 20.02.1832.

Падзелы Рэчы Паспалітай і ўключэнне тэрыторыі Беларусі і Літвы ў склад Расійскай імперыі азначалі пачатак новага перыяду ў іх гісторыі. Адной з характэрных яго рысаў з’яўлялася існаванне негатыўных адносінаў часткі насельніцтва гэтых тэрыторый, пераважна вышэйшага, прывілеяванага саслоўя, да самога факта ліквідацыі Рэчы Паспалітай, якая з’яўлялася для іх радзімай. Таму на працягу ўсяго перыяду знаходжання Беларусі і Літвы ў складзе Расійскай імперыі (1772–1917 гг.) на іх землях разгортваўся вызваленчы рух, які сваёй галоўнай мэтай ставіў аднаўленне падзеленай Дзяржавы.

Асобнае месца ў гісторыі Беларусі названага перыяду займаюць паўстанні 1794 г., 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг. У савецкі час і гэтыя паўстанні, і ўвесь грамадска-палітычны рух у Беларусі і Літве ў першай палове XIX ст. разглядаліся выключна як *польскія*, што збядняла беларускую гісторыю і гістарыяграфію. Тагачаснае і сучаснае разуменне тэрмінаў *польскі* і *паляк* прынцыпова адрозніваюцца [гл. 4.2], таму спрошчаны падыход, які панаваў у савецкай гістарыяграфіі і характарызаваўся простым капіраваннем тэрміналогіі дакументаў першай паловы XIX ст. і накладаннем яе на сённяшнюю сітуацыю, супярэчыць прынцыпу навуковасці і не можа задавальняць даследчыкаў гісторыі Беларусі. Падобны падыход да ацэнкі дзейнасці ўраджэнцаў Беларусі і Літвы ў разгортванні вызваленчага руху збядняе іх ролю ў гэтай барацьбе. Апрача таго, марксісцкі падыход з ідэяй класавай барацьбы выразна прыніжаў ролю змагароў, якія паходзілі са шляхецкага саслоўя. Менавіта са шляхты рэкрутавалася пераважная большасць як удзельнікаў паўстанцкіх атрадаў розных гадоў, так і сяброў падпольных арганізацый 20–60-х гг. XIX ст. Без разумення прычын іх дзейнасці, асноўных сродкаў барацьбы і асэнсавання наступстваў немагчыма даследаванне больш позняга перыяду, калі пачалося фарміраванне беларускага (у сучасным сэнсе гэтага тэрміна) нацыянальнага руху і беларускай нацыі, у чым шляхта таксама прымала самы актыўны ўдзел.

Кожнае з вышэйзгаданых паўстанняў выклікала ў сваю чаргу іншую з'яву — эміграцыю пэўнай часткі яго ўдзельнікаў у Заходнюю Еўропу і іншыя часткі свету. Уласныя патрыятычныя перакананні і рэпрэсіўныя захады расійскіх уладаў не дазвалялі змагарам спыніць сваю барацьбу нават тады, калі іх ваеннае паражэнне станавілася фактам. У гэты перыяд айчыннай гісторыі палітычная эміграцыя атрымала сваё найбольшае (у параўнанні з часамі ВКЛ і Рэчы Паспалітай) развіццё.

Феномен палітычнай эміграцыі з Рэчы Паспалітай, і з ВКЛ у прыватнасці, звязаны з пачаткам змагання за незалежнасць дзяржавы, галоўным чынам супраць Расійскай імперыі, і пачынае развівацца з канца 1760-х гг. За перыяд з 1768 па 1815 гг. мелі месца некалькі хваль палітычнай эміграцыі з беларуска-літоўскіх губерняў:

1) *паслябарская*, звязаная з падаўленнем Барскай канфедэрацыі і правядзеннем першага падзелу Рэчы Паспалітай;

2) *трэцятравеньская*, выкліканая адменай Канстытуцыі 3 траўня 1791 г. і другім падзелам Рэчы Паспалітай;

3) *касцюшкаўская*, якая з'явілася пасля паражэння паўстання 1794 г. і ліквідацыі Рэчы Паспалітай;

4) *напалеонаўская*, звязаная з аднаўленнем польскай дзяржаўнасці ў выглядзе Герцагства Варшаўскага, створанага ў 1807 г. імператарам Напалеонам, спадзяваннямі на поўнае аднаўленне Рэчы Паспалітай і ваенным паражэннем напалеонаўскіх войскаў у кампаніі 1812 г. супраць Расіі.

Адносна ліберальны рэжым, які панаваў ва ўтвораным у 1815 г. Каралеўстве Польскім, ствараў магчымасці для вяртання на радзіму тых прыхільнікаў Напалеона, якія пакінулі яе пасля заняцця расійскімі войскамі земляў былога ВКЛ і Княства Варшаўскага. У эміграцыі засталіся толькі адзінкавыя асобы, напрыклад, Т. Касцюшка, які пасяліўся ў Швейцарыі пасля атрымання амністыі ад Паўла I і жыў тут да сваёй смерці ў 1817 г. [292].

У цэлым усе пералічаныя вышэй хвалі эміграцыі яднаюць некалькі рысаў. Па-першае, яны не былі шматколькаснымі. Радзіму пакідалі не больш за некалькі сотзень асоб. Па-другое, яны не былі працяглымі: за рэдкім выключэннем эмігранты вярталіся на радзіму пасля некалькіх гадоў жыцця на чужыне. Эміграцыя пасля паўстання 1830–1831 гг. (паслялістападаўская) мела прынцыпова іншыя паказчыкі. Землі былой Рэчы Паспалітай пакінулі тысячы чалавек, прычым большая іх частка ўжо ніколі не вярнулася назад.

Уяўленне пра эміграцыю ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. як пра малазначны эпізод айчыннай гісторыі стала прычынай адсутнасці ў беларускай гістарыяграфіі асобных манаграфічных даследаванняў па гэтай тэматыцы. Як правіла, аўтары абмяжоўваліся толькі павярхоўным аглядам гісторыі эміграцыі. Тым больш не рабіліся спробы прасачыць дзейнасць ураджэнцаў Беларусі і Літвы ў эміграцыі. Іх звычайна залічвалі да ўсіх *польскіх* эмігрантаў





і не цікавіліся своеасаблівасцямі іх становішча па-за межамі радзімы, а таксама ўзаемаадносінамі з ураджэнцамі ўкраінскіх зямель ці Каралеўства Польскага. Не звярталася ўвага і на той факт, што па-за межамі радзімы многія эмігранты развівалі свае навуковыя і літаратурныя здольнасці. Гэтаму садзейнічала адсутнасць у краінах, дзе жылі эмігранты, жорсткай цэнзуры, якая існавала ў Расійскай імперыі, а таксама даступнасць для іх лепшых еўрапейскіх цэнтраў вышэйшай адукацыі.

Хіба што не найбольш важнай праблемай пры даследаванні дзейнасці эмігрантаў з'яўляецца вызначэнне колькасці ўраджэнцаў Беларусі і Літвы, якія пасля паражэння паўстання пакінулі радзіму. Гэта важна таму, што ад колькасці самым непасрэдным чынам залежыць патэнцыял эміграцыі — фізічны і інтэлектуальны, — які яна ў выпадку патрэбы магла б выкарыстаць. З гэтым жа звязана праблема рассялення эмігрантаў па тэрыторыі Заходняй Еўропы і ўсяго свету ўвогуле, а таксама па тэрыторыі Францыі ў прыватнасці, паколькі там пасялілася пераважная большасць выгнаннікаў. Як гэта будзе паказана ніжэй, рассяленне ў пэўнай ступені ўплывала і на арганізацыйнае афармленне эміграцыі з Беларусі і Літвы.

Не менш істотным з'яўляецца пытанне самасвядомасці і самавызначэння ў эміграцыі ўраджэнцаў беларуска-літоўскіх губерняў. Тут неабходна адзначыць, якія тэрміны выкарыстоўвалі эмігранты для самаакрэслення і акрэслення сваіх суайчыннікаў, якую тэрыторыю яны лічылі сваёй айчынай. Гэтая праблема тым больш важная для беларускай гістарыяграфіі, што многія папярэднія польска- і рускамоўныя працы цалкам ігнаравалі рэгіянальныя своеасаблівасці прадстаўнікоў беларуска-літоўскіх губерняў у грамадска-палітычным руху першай паловы XIX ст. Гэтая традыцыя захавалася да сённяшняга дня. На працягу доўгага часу гісторыкі XX–XXI стст., пераймаючы тэрміналогію рускамоўных крыніц, створаных царскімі ўладнымі органамі, і афіцыйнай царскай гістарыяграфіі, паўстанне 1830–1831 гг. называлі *руска-польскай вайной*, *польскім паўстаннем* і г. д. Пры гэтым не рабілася спроба растлумачыць сэнсавае напаўненне тэрмінаў *польскі*, *паляк* і г. д., разуменне якіх мянялася на працягу стагоддзяў [25; 107]. Да гэтага часу айчынная гістарыяграфія шукае адказ на пытанне, кім жа лічылі сябе прадстаўнікі шляхты Беларусі і Літвы ў першай палове XIX ст. — *ліцвінамі* ці *палякамі*, хаця падобная пастаноўка пытання сама па сабе з'яўляецца некарэктнай.

Апрача таго, трэба мець на ўвазе той факт, што самаакрэсленне і самасвядомасць, а значыць, і супрацьпастаўленне сябе іншым, стварае патэнцыяльную глебу для з'яўлення супярэчнасцяў паміж рознымі групамі эмігрантаў. У дадзеным выпадку ўзніклі супярэчнасці паводле прынцыпу рэгіянальнага паходжання, а ўзаемадзеянне падобнага фактара з сацыяльнымі праблемамі можа выклікаць самыя розныя формы праяўлення. Наяўнасць разыходжання ў поглядах паміж ураджэнцамі зямель былога ВКЛ (*ліцвінамі*) з аднаго боку

і выхадцамі з Каралеўства Польскага (*караняжамі*) з другога не раз адзначалася гісторыкамі эміграцыі, але іх прычыны да гэтага часу заставаліся ў значнай ступені нераскрытымі. А гэта тым больш важна, што яны аказалі немалы ўплыў на стварэнне эмігрантамі з беларуска-літоўскіх губерняў некалькіх асобных арганізацый.

Адной з яскравых праяваў дзейнасці эмігрантаў з Беларусі і Літвы з'яўляюцца заснаваныя імі арганізацыі, праз якія яны намагаліся вырашаць свае праблемы і дасягаць сваіх мэтаў. Таварыства Літоўскае і Рускіх Зямель і створаны пры ім Літоўскі Вайсковы Камітэт, Таварыства Братэрскага Аб'яднання і Літоўска-Рускі Клуб — гэта тыя спробы арганізацыйнага афармлення *ліцвінаў* і *русінаў*, якія былі здзейснены імі ў *паслялістападаўскай* эміграцыі. Кожная з гэтых арганізацый займае сваё месца ў гісторыі *Вялікай эміграцыі* і ўнесла той ці іншы ўклад у яе дасягненні ці паражэнні, аднак як яны самі, так і мноства пытанняў, звязаных з іх дзейнасцю, працяглы час заставаліся невядомымі айчыннаму гісторыку.

Палітычная эміграцыя — гэта ні ў якім разе не бязмэтавае пражыванне на тэрыторыі іншых дзяржаў у чаканні лепшага лёсу і не свядомае жаданне ўліцца ў іншае грамадства, што характэрна, напрыклад, для эканамічнай эміграцыі. Мэтай прадстаўнікоў *Вялікай эміграцыі* быў працяг палітычнай барацьбы, у тым ліку праз узнаўленне ўзброенага паўстання, вынікам чаго павінна стаць вызваленне айчыны і адраджэнне Рэчы Паспалітай. У сувязі з гэтым адна з найбольш важных задач эмігрантаў — данесці сваё слова да радзімы, занятай ворагам, каб перадаць звесткі пра сябе і аказаць ёй дапамогу ў арганізацыі барацьбы. З гэтай прычыны набывае немалую важнасць праблема ўплыву эміграцыі на грамадска-палітычны рух на радзіме і ацэнка ступені гэтага ўплыву.

Як вядома, пісьменніцкая і публіцыстычная дзейнасць з'ўлялася адным з асноўных відаў прапаганды і агітацыі, а значыць, і ідэалагічнай барацьбы ў цэлым. Для палітычнай эміграцыі якой бы то ні было хвалі гэта характэрна яшчэ ў большай ступені. Удзельнікі пацярпелай паражэнне барацьбы атрымалі значную колькасць часу і сіл, што ў сукупнасці са свежымі моцнымі ўражаннямі і эмоцыямі становіцца штуршком да актыўнай творчасці. *Вялікая эміграцыя* ў цэлым, і ўраджэнцы Беларусі і Літвы як яе частка, з'ўляецца хіба што не найбольш яскравым прыкладам гэтага. *Паслялістападаўскімі* эмігрантамі на працягу ўсяго часу іх жыцця па-за межамі радзімы было заснавана больш за 100 перыядычных выданняў, выдадзены тысячы кніг, брашур, улётак і да т. п., галоўнай мэтай якіх, проста ці ўскосна, было імкненне да гуртавання сіл дзеля вызвалення радзімы. І хаця многія творы далёкія ад эстэтычнай прыгажосці ці высокай якасці, але кожны з іх варты быць зразуметым у тым кантэксце, у якім ён з'ўляўся і функцыянаваў.





Нягледзячы на прыкладзеныя намаганні і шчырасць імкненняў, эміграцыі не ўдалося дасягнуць сваёй галоўнай мэты — хуткага ўзнаўлення паўстання на радзіме. Храналагічна блізкія рэвалюцыйныя падзеі на землях былой Рэчы Паспалітай адбыліся толькі падчас *Вясны Народаў* — у 1846–1849 гг., — ды і тыя былі падаўлены дзяржавамі, што здзейснілі яе *разбор*. Менавіта ў кантэксце такой вялікай працягласці эміграцыі, а таксама малой паспяховасці намаганняў падчас яе і неабходна разумець факт прыняцця некаторымі эмігрантамі палітычнай амністыі ад расійскіх уладаў, а яшчэ больш канкрэтна — ад расійскага імператара (Мікалая І ці Аляксандра ІІ), які асабіста даваў рэзалюцыю наконт кожнага падобнага прашэння. Даследаванне гэтай асаблівасці эміграцыі яшчэ практычна не праводзілася, аднак гэта тым больш важна, што амністыю выкарысталі некаторыя вядомыя дзеячы культуры Беларусі — Напалеон Орда, Аляксандр Рыпінскі і інш.

Усё вышэйсказанае пераконвае, што даследаванне жыцця і дзейнасці ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. у Заходняй Еўропе з'ўляецца неабходным для айчыннай гістарыяграфіі і выступае перспектыўным накірункам навуковых распрацовак.

Гэтая манаграфія базуецца на дысертацыі на атрыманне ступені кандыдата гістарычных навук, абароненай аўтарам 15 красавіка 2008 г. у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ніжняя храналагічная мяжа эміграцыі — дата яе пачатку — 1831 год. Вызначэнне верхняй мяжы выклікае большую складанасць. Пры абсалютызацыі гэтага крытэрыя яна можа быць вызначана як дата смерці апошняга з эмігрантаў (паводле наяўных звестак, гэта 1909 г.), аднак падобны падыход будзе з'ўляцца некарэктным. У гэтай манаграфіі верхняя храналагічная мяжа — 70-я гг. ХІХ ст., калі скончылася пісьменніцкая дзейнасць часткі эмігрантаў, якія дажылі да таго часу.

Для адбору асобаў, дзейнасць якіх даследавана ў манаграфіі, ужываліся тры крытэрыі:

1) нараджэнне асобы на тэрыторыі адной з пяці заходніх губерняў Расійскай імперыі: (Віленская, Гродзенская, Мінская, Віцебская, Магілёўская);

2) удзел у паўстанні 1830–1831 гг. на землях былой Рэчы Паспалітай;

3) пераход асобы пасля паражэння паўстання ў краіны Заходняй Еўропы ў 30-х гг. ХІХ ст.

Іншыя крытэрыі (этнічнае ці сацыяльнае паходжанне, веравызнанне, прафесійныя заняткі і да т. п.) не ўжываліся.

У сувязі з абранымі крытэрыямі ў манаграфіі не аналізуецца дзейнасць тых асобаў, якія паходзілі з беларуска-літоўскіх губерняў і знаходзіліся ў эміграцыі, але не прымалі ўдзел у паўстанні 1830–1831 гг. (Адам Міцкевіч, Валенты Ванькавіч, Леанард Ходзька і інш.). Аднак некаторыя з іх згадваюцца ў кантэксце даследавання эміграцыйнага жыцця.

Мэтазгодна прывесці тлумачэнні некаторых ужытых у манаграфіі тэрмінаў.

У першую чаргу варта падаць дэфініцыю тэрміна *эміграцыя*. Пад гэтым тэрмінам разумеецца перасяленне са сваёй айчыны ў іншыя краіны па эканамічных, палітычных, рэлігійных і іншых прычынах. У гэтай манаграфіі вядзецца размова пра эміграцыю па палітычных матывах. Тэрмін *паслялістападаўская эміграцыя* ўспрыняты з польскай гістарыяграфіі. Ён ужываецца ў адносінах да той хвалі эміграцыі, пачатак якой дало паражэнне паўстання 1830–1831 гг. — *лістападаўскага*.

Пад тэрмінам *беларуска-літоўскія губерні* разумеюцца адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі (губерні), у адносінах да якіх у 1831 г. ужываліся тапонімы *Беларусь* і *Літва*: Віленская, Віцебская, Гродзенская, Магілёўская і Мінская губерні. Галоўнай прычынай злучанага ўжывання гэтага тэрміна (*беларуска-літоўскія*), а не асобнага (*беларускія і літоўскія*), з'яўляецца адсутнасць у 1831 г. дакладна акрэсленай мяжы паміж геаграфічнымі абшарамі *Беларусь* і *Літва*.

Выказваю падзяку Нацыянальнаму гістарычнаму архіву Беларусі і асобна яго дырэктару Але Купрыянаўне Галубовіч за нададзеныя матэрыялы, Варшаўскаму ўніверсітэту і асобна Інстытуту інтэрдысцыплінарных даследаванняў і Інстытуту Усходняй Еўропы пры ім, Польскай бібліятэцы ў Парыжы, прафесару, доктару габілітаванаму Анджэю Новаку, прафесару, доктару габілітаванаму Юрасю Гарбінскаму, кандыдату гістарычных навук, дацэнту Вользе Гарбачовай, кандыдату філалагічных навук Аляксандру Фядуце, а таксама шаноўным рэцэнзентам і ўсім установам і людзям, дзякуючы дапамозе якіх напісанне і выданне гэтай манаграфіі стала магчымым.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ АЎТАРА

1—А. Браты Янушкевічы і тавянізм: складаныя шляхі эміграцыі // Асоба і час: Беларускі біяграфічны альманах. — Вып. 2. — Мінск: Лімарыус, 2010. — С. 115–129.

2—А. «Вялікая эміграцыя» і лёсы паўстанцаў 1830–1831 гг. з Віцебскай губерні // Commentarii polocenses historici. — Т. 2. — Наваполацк-Мінск, 2005. — С. 19–22.

3—А. Вяртанне з эміграцыі на радзіму ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. з Беларусі і Літвы // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. — 2008. — № 4. — С. 52–59.

4—А. Дамінік Квяткоўскі і яго «Думкі пра фарміраванне ўзброенай сілы» // Асоба і час: Беларускі біяграфічны альманах. — Вып. 1. — Мінск: Лімарыус, 2009. — С. 117–128.

5—А. Ліцвін ці паляк? Да праблемы самавызначэння насельніцтва беларуска-літоўскіх зямель у 30–40-я гг. XIX ст. (на падставе матэрыялаў «Вялікай эміграцыі») // Актуальные проблемы из исторического прошлого и современности в общественно-гуманитарных и социо-религиоведческих науках Беларуси, ближнего и дальнего зарубежья: материалы международной научно-теоретической конференции (Витебск, 19–20 апреля 2007 г.). — Витебск: Изд-во УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2007. — Ч. 1. — С. 66–68.

6—А. «Ліцвіны засталіся палякамі»: Урачыстае пасяджэнне Таварыства Літоўскага і Рускіх Зямель 25 сакавіка 1832 г. у Парыжы // Беларусь і беларусы ў прасторы і часе: Зборнік да 75-годдзя прафесара Адама Мальдзіса / пад рэд. С. Запрудскага, А. Фядуты, З. Шыбекі. — Мінск: Лімарыус, 2007. — С. 191–203.

7—А. Міхал Ходзька (1808–1879): паўстанец, эмігрант, літаратар // …Пачуць, як лёсу валяцца муры: Памяці Генадзя Кісялёва. — Мінск: Лімарыус, 2009. — С. 217–249.

8—А. Палітыка царскага ўрада ў час паўстання 1830–1831 гг. Эміграцыя з беларускіх зямель // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі канца XVIII — пачатку XX ст: праблемы, здабыткі, перспектывы / Н. В. Анофранка [і інш.]; навук. рэд. В. В. Яноўская. — Мінск: Беларуская навука, 2006. — 446 с. — С. 130–149. (сумесна з А. М. Філатавай).

9—А. Рукапісныя дакументы Таварыства Літоўскага і Рускіх Зямель і Таварыства Братэрскага Аб'яднання ў бібліятэчных сховішчах Польшчы // Беларускі археаграфічны штогоднік. — Вып. 8. — Мінск: БелНДІДАС, 2008. — С. 89–102.

10—А. Створення і діяльність у Франції Товариства литовських і руських земель (1831–1833) // Український історичний збірник (2006) / Головний редактор Т. Чухліб; заступник головного редактора А. Блануца. — Вип. 10. — К.: Інститут історії України НАН України, 2007. — С. 79–87.





11—А. Стварэнне і дзейнасць Мінскага камітэта па дапамозе палітычным эмігрантам і палітычным ссыльным, якія вярталіся на радзіму (1859–1862 гг.) // Архіварыус. — Вып. 5. — Мінск, 2006. — С. 199–203.

12—А. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. — ураджэнцы беларуска-літоўскіх губерняў: эміграцыя, гуртаванне, дзейнасць / Аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук. — Мінск: БДУ, 2008. — 22 с.

13—А. Уладзіслаў Плятэр і Раперсвільскі музей // Спадчына. — 2003. — № 4–5. — С. 29–38.

14—А. Эміграцыя з беларускіх зямель у 1831–1863 гг.: айчынная і польская гістарыяграфія пытання // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. — 2005. — № 5. — Ч. 2. — С. 47–49.

15—А. Эміграцыя з беларуска-літоўскіх зямель у Заходняй Еўропе (1831–1863 гг.) // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. — 2007. — № 3. — С. 52–61.

16—А. Эміграцыя ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг.: крыніцы з гістарычных архіваў Беларусі і Літвы // Архіварыус. — Вып. 6. — Мінск: НГАБ, 2008. — С. 160–168.

17—А. Эміграцыя ў Заходнюю Еўропу ўдзельнікаў паўстання 1830–1831 гг. з Гродзенскай губерні // Весці Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Серыя гуманітарных навук. — 2007. — № 2.

# ПАКАЗАЛЬНІК ІМЁНАЎ


Агінскі Габрыэль *133*
Ажэшка Антоні *98, 100*
Алендскі Гектар *101*
Алізар Васіль *85*
Алізар Нарцыз *46*
Алізароўскі Тамаш *128*
Алькеніцкі Мойша *85, 88*
Альцыята Ян *117*
Аляксандр II *9, 134, 137*
Андрайковіч Адам *144*
Андрушкевіч Шыман *133*
Анцыпа Ільдэфонс *139*
Аранскі Ксаверы *58*
Арліцкі Людвік *96*
Арлоўскі Эдвард *32*
Асахоўскі Ігнат *145*
Аскерка Дамінік *84–87*
Аскерка, нар. Валовіч, Ганна *84*
Астроўскі Антоні *68, 123–124*
Аткевіч Станіслаў *134*
Бабянскі Вінцэнт *144*
Багдановіч Аляксандр *145*
Багдановіч Міхал *139*
Багрым Паўлюк *128*
Багуслаўскі Юзаф *102–103*
Бажэнцкі Эдвард *136*
Балінскі Міхал *89*
Бандзкевіч Ануфры *146*
Баневіч Уладзіслаў *145*
Бараноўскі Казімір *90*
Баркоўскі Караль *56*
Баркоўскі Ян *67, 152*
Барткевіч Вінцэнт *59*
Баршчэўска Аліна *12*
Басанж Гектар *118*
Башчэвіч Крыспін *62–64, 145*
Белазерскі Станіслаў *32*
Белапятровіч Ежы *108*
Белапятровіч, нар. Гедройць, Кунегунда *108–109, 153*
Бенкендорф Аляксандр *92*
Бергель Аляксандр *41*
Бергель Вайцех *145*
Бергель Зыгмунд *143*
Бітэрніх Эдвард Мікалай *35*
Бразевіч Караль Леанард *41*
Бракгаўз Фрыдрых *117*
Бранікоўскі Караль *59*
Бронскі Антоні *82*
Брынк Ежы *98*
Бударкевіч Міхал *90*
Будрэвіч Ігнат *114*
Букаты Рамуальд *67, 152*
Букгарт Сіверс *97*
Булгак Аляксандр *134, 138, 146*
Булгак Павел *87–88*
Булгак Тамаш *98*
Булгарын Ежы *30, 61–65, 143*
Бурба Адам *35–36*
Бурба Аляксандр *59*
Бурнейка Антоні *145*
Буткевіч Стэфан *145*
Буткевіч Ян *37*
Быстраноўскі Людвік *104*
Бэм Юзаф *35, 41, 45, 53, 55, 58, 118*
Бэрг Мікалай Васілевіч *78*
Бялецкі Роберт *33*
Бялінскі Валеры *40–41*
Вадзінскі Караль Эдвард *48–49*
Вайткевіч Шыман, ксёндз *62*
Валадковіч Аляксандр *40, 126–127, 132*
Валігурскі Аляксандр *104*
Валіцкі Валеры *145*
Валовіч Ганна, v. Аскерка *84*
Валовіч Казімір *82*
Валовіч Міхал *33, 82–88, 90, 93, 109,111–112, 153*
Валовіч Ян *86, 88*
Ваньковіч Валенты *9*
Варкулевіч Аляксандр *124*
Вароніч, прымас *147*
Васілеўскі Зыгмунт *11*
Васілеўскі Юзаф *90*
Васіліцкі Тамаш *86–87*
Верашчынскі Язафат *122*
лё Вілен Франсуа *153–154*







Вінгілевіч Скібінскі Юзаф *144*
Віславух Віктар *139*
Вітаўт *74, 126, 147*
Віткоўскі Міхал *139–140*
Вішань Валент *66*
Вішнеўская Паўліна, v. Шыманская *97*
Вішнеўскі Зянон *133*
Вольскі Адам *32*
Ворцэль Станіслаў *12, 56, 79*
Вялічка Антоні *103*
Вялічка Францішак *37*
Вянгерскі Фелікс *105*
Вярбіцкі Вінцэнт *144*
Вярніцкі Аляксандр *12, 49*
Вяшнеўскі Людвік *145*
Гадон Любамір *11, 55, 61*
Гадон Уладзімір *60, 124–125*
Гадэбскі Францішак Ксаверы *123*
Галінскі Францішак *145*
Галубовіч Ала Купрыянаўна *10*
Галянзоўскі Севярын *119*
Галянкоўскі *86–88*
Гарадэцкі Ануфры *37*
Гараін Тадэвуш *35*
Гарбачова Вольга Васілеўна *10, 12, 59, 119*
Гарбінскі Юрась *10*
Гардон Уладзіслаў *98*
Гардынскі Юзаф *90*
Гарныш Антон *85*
Гарубовіч Канстанцін *113*
Гарыбальдзі Джузэпэ *121*
Гарэцкі Антоні *16, 73, 113, 118, 135, 153*
Гаўрыленка Максім *93–94*
Гафмайстар Апалін *102–103*
Гаштаўт Вацлаў *146*
Гедгаўд Каетан *143*
Гедройць Кунегунда, v. Белапятровіч *108–109, 153*
Гейсмар Фёдар *100*
Гелгуд Антоні *25, 42, 74, 77, 82, 97*
Гецальд Стэфан *33, 81, 93*
Глушневіч Антоні *48, 53, 79*
Гопэн Аляксандр *144*
Гоўвальт Каміл *144*
Гофман Караль Барталамей *73, 120*
Грабавецкі Яцэнты *27*
Грабоўскі Маўрыцы *40*
Грабоўскі Ян *39*
Грабоўскі, ген. *113*
Граткоўскі Фердынанд *134*
Граткоўскі Ян *48*
Граф Напалеон *39, 64, 146*
Грос Юзаф *146*
Грос Юльян *62, 146*
Гружэўскі Юльюш *110*
Грыневіч Міхал *145*
Губарэвіч Казімір *145*
Губарэвіч Канстанцін *61*
Гуммэль Ян *144*
Густовіч Канстанцін *146*
Гэльтман Віктар *11, 102, 113–115, 153*
Гюго Віктор *120*
Гяркoвіч Аляксандр *144*
Гяцэвіч (Гячэвіч) Караль *54, 62, 143*
Гяцэвіч (Гячэвіч) Фелікс *65, 146*
Гячэвіч Дамінік *145*
Дабравольскі Канстанцін *102*
Дабранскі Юзаф *146*
Далгарукаў Мікалай, князь *12, 84, 87, 91*
Дамейка Ігнат *27, 41, 52–53, 57, 73, 83, 110, 118, 120, 123, 136, 154*
Даўнаровіч Апалоніуш 144
Дварэцкі Ян *64, 66, 146*
Двярніцкі Юзаф *25, 47, 92*
Дзванкоўскі Валерыян *144*
Дзібіч Іван *24*
Дзявіцкі Каспар *81*
Дмахоўскі Вінцэнт *132*
Дмахоўскі Генрык *29, 33, 49, 93–96, 139, 153*
Дмахоўскі Уладзімір *73*
Доўбар Дамінік *144*
Доўгірд Фларыян *67, 152*
Драздоўскі Станіслаў *146*
Друцкі-Любецкі, кн. *139*
Дыдынскі Ян *133*
Дырмант Канстанцін *145*
Дэмбінскі Адольф *40*
Дэмбінскі Генрык *45, 88, 93, 129*
Дэмбоўскі Стэфан *118*
Елавіцкі Аляксандр *118*
Ельскі Людвік *29, 39*

Есман Людвік *146*
Есьман Аляксандр *59, 113*
Жаброўскі Ігнат Оскар *125*
Жавускі Отан *40*
Жарданоўскі *102*
Жупанскі Ян Канстанцін *128*
Жылінскі Ксаверы *146*
Жылінскі Станіслаў *35*
Жылінскі Ян *108*
Забела Юзаф *40*
Завістоўскі Казімір *146*
Завіша Артур *81, 112*
Залескі Браніслаў *102, 123, 127*
Залескі Вінцэнт *144*
Залескі Канстанцін *16, 29, 38, 44, 50, 52, 54–55, 57–58, 73*
Залескі Юзаф Багдан *73*
Залеўскі Іпаліт *32*
Заліўскі Юзаф *14, 33–34, 49, 64–65, 77–81, 83–84, 86, 92–97, 101, 107, 109, 111, 115, 117, 131, 154*
Замбрыцкі Людвік *48–49*
Замбрыцкі Ян *145*
Замойскі Уладзіслаў *45, 46*
Зан Стэфан *73*
Зан Тамаш *116*
Зброжак Аляксандр *96*
Звяркоўскі Валенты *79, 123*
Зугарэўскі Станіслаў *140*
Зялінскі Міхал *136*
Зялінскі Уладзімір *136*
Зянковіч Антоні *138–139*
Зянковіч Віктар *42*
Зянковіч Леан *113–117*
Зянковіч Юзаф *48, 59, 110*
Іваноўскі Алаізі *144*
Івашкевіч Ігнат *145*
Ізабэла, каралева партуг. *38*
Ізэншмідт-дэ-Мільбітц Аляксандр *42*
Казлоўскі Антоні *32*
Казьмян Станіслаў *128*
Кайсевіч Геранім *54, 57, 73–74, 134*
Калантай Гуга *117*
Каласоўскі Францішак *145*
Калембка Славамір *11, 38, 106*
Календа Караль *87–88*
Калінка Валерыян *118*
Каліноўскі Станіслаў *67, 152*
Калусоўскі Генрык *40, 61–62, 65–66, 143, 153*
Калыска Адам *48, 111, 126*
Калясінскі Бенядзікт *145*
Камблевіч Юзаф *37*
Каменскі Люцыян *62*
Каменскі Юзаф *39, 61, 143*
Каменскі Юльян *61, 143*
Камінскі Станіслаў *133, 134*
Канапацкі Антоні *143*
Канарскі Станіслаў *117*
Канарскі Шыман *14, 44, 77, 82, 96–101, 104, 111, 116–117, 153*
Капчынскі Пётр *16, 53, 58*
Капярніцкі Нарцыз *37*
Карабевіч Эдмунд *64*
Карвоўскі Фердынанд *41*
Карпінскі Францішак *117*
Карповіч Андрэй *144*
Карповіч Аўгустын *66, 146*
Карповіч Юзаф *144*
Касцюшка Тадэвуш *6, 116*
Кашыц Юзаф *30, 46, 73, 110, 113, 126*
Кільвэйн Станіслаў *65, 146*
Кільдышка Юдьян *145*
Кірклеўскі Юзаф *146*
Кісялеўскі Дыянізі *136*
Клімашэўскі Іпаліт *59, 73, 123–124*
Клімовіч Ян *144*
Клінібэрт Мікалай *144*
Клот Юзаф *102*
Клот Ян *40*
Клышэўскі Уладзіслаў *12*
Клюкоўскі Ігнат *59, 125*
Клячко Юльян *118*
Козел Адам *146*
Комар Станіслаў *133*
Комар Францішак *133*
Корсак Іаахім *144*
Корсак Ян *144*
Красінскі Генрык *126–127*
Красінскі Зыгмунт *116*
Красіцкі Казімір *88*
Краскоўскі Тамаш *108*





Красніцкі Леанард *145*
Красноўскі Адольф *75*
Крафт, генерал прус. *26*
Крашэўскі Юзаф Ігнат *118, 124*
Крукавецкі Ян, ген. *88*
Крываблоцкі Ігнат *108*
Крыўкоўскі Генрык *65, 145*
Кузьмін-Караваеў Аглай *100*
Кулінскі Антоні *146*
Кульвець Даніэль *32*
Кульчыцкі Ян *67, 152*
Кумпікевіч Канстанцін *133*
Купер Джэймс Фенімар *122*
Курбацкі *85–86*
Кучынскі Леапольд *145*
Кучынскі Пётр Уладзіслаў *32*
Кучынскі Францішак *35*
Кяневіч Феліks *101, 105, 131, 134*
Кярсноўскі Міхал *39, 62, 143*
Лабаноўскі Антэнор *40*
Лазоўскі Леанард *32, 144*
Лапінскі Дамінік *144*
Лапко Аляксандр *85, 87*
Леапольд I *40*
Левасёр, консул франц. *27*
Ленартовіч Казімір *16, 67, 70, 152*
Ліманоўскі Баляслаў *12, 78*
Лісецкі Міхал *56, 59, 134*
Лукашэвіч Вільгельм *62, 145*
Лукоўскі Андрэй *145*
Лышчынскі Адам *136*
Лышчынскі Генрык *136*
Людовік Філіп *28, 32, 80, 133*
Лялевель Іаахім *39, 44, 47, 49, 55, 63, 65, 71–74, 77–78, 89, 92, 94–97, 99, 104, 110, 119, 154*
Лямэнэ Рабэр *112*
Лянкевіч Тадэвуш *39*
Лясковіч Уладзіслаў *111, 146*
Ляскоўскі Антоні *145*
Лях-Шырма Крыстын *129*
Ляшчынскі Станіслаў *60*
Магдзінскі Тэафіл *102*
Мазіні Джузэпэ *44*
Макарскі Юзаф *62, 145*
Малахоўскі Казімір *31, 116*
Малевіч Гіляры *32*
Маліцкі Тэадор *145*
Малішэўскі Юзаф *60*
Маранд Шарль *30, 61*
Мартынкевіч Ян *85, 87*
Мартыновіч Роля Геранім *146*
Мартыноўскі Геранім *62*
Мархель Уладзімір *128*
Марціноўскі Юльян *146*
Марціноўскі Ян *146*
Матушэвіч Вінцэнт *64–65, 67–68, 110, 146, 152*
Махвіц Адам *145*
Махвіц Канстанцін *62, 146*
Мацэвіч Станіслаў *63*
Машкоўскі Каспер *98–99*
Мераеўскі Мікалай *131*
Мераслаўскі Людвік *102*
Мігурскі Вінцэнт *95, 144*
Мікалай I *9, 21, 26, 91, 103, 131, 133*
Мілашэўскі Міхал *134*
Мількевіч Эдвард *40, 145*
Міркавіч Фёдар *102*
Мірскі Мікалай *144*
Мірскі Фердынанд *63, 143*
Мірскі Тэафіл, князь *88*
Місінскі Генрык *94*
Міхалоўскі Алаізі *144*
Міхалоўскі Юзаф *139*
Міхалоўскі Юльюш Цэзар *145*
Міхелеовіч Аўсей *85*
Міціна М. *12*
Міцкевіч Адам *9, 11–12, 16, 41, 49–50, 60, 67, 71–74, 108, 110, 112, 118–123, 128*
Міцкевіч Рафал *144*
Міцкевіч Уладзіслаў *12, 112, 120*
Міцкевіч Францішак *41, 73*
Міцюта Юзаф *65, 146*
Мор Томас *129–130*
Мураўёў Міхаіл Мікалаевіч *23, 84, 86–87, 90–91*
Мураўскі Юльян *144*
Мюрэй *128*
Мялешка Пётр *85*
Мярвінскі Стэфан *143*
Навіцкі Вінцэнт *73*

Навіцкі Гіляры *144*
Навіцкі Людвік *64, 66, 146*
Навіцкі Напалеон *131*
Нагумовіч Ізыдар *85, 87*
Накваскі Генрык *71*
Напалеон I *6, 28*
Напалеон III *67, 135*
Наркевіч Ігнат Юзаф *146*
Нарэўскі Юзаф *32*
Невяровіч Людвік *145*
Невяровіч Уладзіслаў *136*
Невяровіч Ян Алаізі *75*
Незабітоўскі Калікст *134*
Незабітоўскі Стэфан *131*
Нешакоць Вінцэнт *109*
Новак Анджэй *10, 12, 58*
Нядзвецкі Леанард *73*
Нямцэвіч Караль *108, 113, 131*
Нямцэвіч-Урсын Юльян *39, 73, 111, 119–120*
Няцюнскі Ігнат *90*
Орда Людвік *98*
Орда Напалеон *9, 136, 139, 153*
Павел I *6*
Падбярэскі Фартунат *39*
Падчашынскі Міхал *50, 54, 56*
Панасюк Васіль *85, 87*
Панасюк Лявон *85–87*
Панасюк Ян *85, 87*
Панятоўскія *44*
Парчэўскі Канстанцін *59*
Пасербскі Платон *35, 103, 139–140*
Патоцкая, кн. *89*
Патрыкоўскі Альфонс *67, 143, 152*
Патрыкоўскі Францішак *67, 152*
Патрыкоўскі Юзаф *55, 65–66, 73–74, 110, 135*
Патуліцкі Казімір *52*
Пераноўскі Любіч Міхал *146*
Песакоўскі Міхал *85–87*
Песляк Караль *65, 138–139, 143*
Петрашэўскі Міхал *133*
Петрашэўскі Тэафіл *133*
Петрусевіч Францішак *144*
Пігань Станіслаў *128*
Пішчатоўскі Адам *82*
Плятэр Людвік *60*
Плятэр Уладзіслаў *12, 30, 39, 47–48, 54, 58–59, 73, 107, 118, 120–122, 154*
Плятэр Цэзар *30, 41, 48, 57–59, 73, 113, 153*
Плятэр Эмілія *110*
Прагалінскі Ян Дамінік *37*
Пранеўскі Марцэлі *67, 152*
Працішэўская Юзэфа *102*
Працішэўскі Адольф *102*
Працішэўскі Антоні *48, 51, 139*
Працішэўскі Геранім *139*
Працішэўскі Францішак *102*
Працлаўскі Леан *58, 82, 96, 109, 153*
Прозар Маўрыцы *59*
Прускі Антоні Станіслаў *37*
Прушынскі Фелікс Прот *40*
Прыалгоўскі Андрэй *59, 67, 152*
Пужыцкі Юзаф *40*
Пунэр Юльюш *144*
Пуслоўскі Фелікс *39, 132, 146*
Пуслоўскі Цітус *82*
Путкамер Ваўрынец *90*
Путкамер Марыя *90*
Пэдра, дон *35, 41, 89*
Пяткевіч Валерыян *29, 44, 48, 94–96*
Пяткевіч Людвік *39, 134*
Пяткевіч Міхал *73, 109*
Пяткевіч Мэдард *109*
Пятроўскі Карнэль *39*
Пятроўскі Руфін *123*
Пятроўскі Тэлесфор *138*
Рагоза Мікалай *75, 143*
Радзевіч Ігнат *98–100*
Радзюк Аляксандр Рыгоравіч *20*
Раецкі Валенты *102*
Рамбялінскі Раймунд *112*
Раморына Джыралама *26*
Ранье Аніцэты, гл. *Рэгнер Аніцэты*
Ратч Васіль *11*
